**Культурна-масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК “Лунінецкая РЦБС” у снежні**

З **2 па 8 снежня** ў бібліятэках праходзіў Тыдзень дабрыні, прысвечаны **Міжнароднаму Дню інвалідаў.**

**2 снежня. ЦБ**. Адбылася навукова-практычная канферэнцыя «Инклюзивное образование: большие дела маленькой библиотеки» (на прыкладзе працы арт-студыі “У фокусе палітры). У анлайн-мерапрыемстве прынялі ўдзел дырэктар і супрацоўнікі Муніцыпальнай бюджэтнай установы культуры “Міжпасяленчая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” Палескай муніцыпальнай акругі (Калінінградская вобласць).

Адкрыла мерапрыемства намеснік дырэктара ГУК “Лунінецкая РЦБС” Вольга Максімаўна Вашкевіч. Далей выступілі: метадыст сектара маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы Ірына Хлуд, старшыня Лунінецкага РА ОО “Беларускае таварыства інвалідаў” Валерый Паўлюкевіч, выкладчык-валанцёр арт-студыі Антаніна Пясоцкая, загадчыца адзела абслугоўвання і інфармацыі ЦБ Алена Гнедзька і бібліятэкар Мікашэвіцкай гарадской бібліятэкі Лілія Баган.

**ЦБ.** На працягу тыдня ў бібліятэцы праходзіла акцыя “Протяни руку дружбы”. Яе супрацоўнікі наведалі на даму інвалідаў-чытачоў з абмежаванымі магчымасцямі здароўя і прапанавалі ім для чытання новыя кнігі і часопісы

**4 снежня. ЦДБ.** Для выхаванцаў адзялення дзённага знаходжання Лунінецкага ТЦСАН прайшла сустрэча “Не оставаться равнодушными”, на якой ішла размова аб сяброўстве і спагадзе, а таксама аб міласэрнасці і аб добрых справах. У канцы мерапрыемства прысутным прапанавалі паглядзець выступленне лялечнага тэатра “Вясёлая карусель”.

**Мікашэвіцкая г.б.** Прайшла акцыя «Добрым словом друг друга согреем».

**5 снежня.** Для ўдзельнікаў клуба “САМІ” правялі ўрок міласэрнасці «Требуется доброта”. На мерапрыемстве гаварылі аб тым, што такое дабрыня, якімі якасцямі павінен валодаць чалавек, прыводзілі прыклады добрых спраў у адносінах паміж людзей. Удзельнікі мерапрыемства чыталі вершы аб сяброўстве, збіралі прыказкі, малявалі паштоўкі для сваіх сяброў.

Таксама ў бібліятэцы была арганізавана выстава творчых работ людзей з інваліднасцю «Души и сердца вдохновенье», на якой дэманстраваліся работы выкананыя ў розных тэхніках. Супрацоўнікі бібліятэкі павіншавалі ўдзельнікаў клуба з юбілейнай датай: 10-годдзем з часу стварэння клуба маладых інвалідаў “САМІ”. У сваю чаргу старшыня клуба ўручыў Мікашэвіцкай г.б. дабрачынны ліст за шматгадовае супрацоўніцтва.

**10 снежня. Мікашэвіцкая г.б.** Да **Дня праў чалавека** на базе Публічнага цэнтра прававой інфармацыі адбыўся круглы стол “У бібліятэку за правам”. На мерапрыемства запрасілі натарыуса Мікашэвіцкай натарыяльнай канторы Алега Фёдаравіча Кузьміна. Алег Фёдаравіч расказаў аб паслугах, якія прадстаўляюцца натарыяльнай канторай, аб ільготах, прадугледжаных для

асоб пажылога ўзросту, пенсіянераў і інвалідаў 1 і 2 групы. Падчас бясплатнага кансультавання грамадзяне атрымалі адказы на свае пытанні.

Прайшлі мерапрыемствы да **Міжнароднага дня памяці ахвяр злачынства генацыду.**
**11 снежня. ЦДБ**. Адбыўся урок гісторыі “Памяць і боль беларускага народа”. На мерапрыемства запрасілі педагога па ваенна-патрыятычнаму выхаванню СШ №1 г.Лунінца М.І. Вячорка.
**12 снежня. ЦБ.** Прайшла дыялогавая пляцоўка «Геноцид белорусского народа». На мерапрыемстве выступілі кіраўнік па ваенна-патрыятычнаму выхаванню І.С.Харытановіч і памочнік пракурора Д.А. Цібец. Ігар Сяргеевіч расказаў аб знішчэнні беларусаў у гады вайны і жахлівых катаваннях мірнага насельніцтва. Дар’я Аляксандраўна пазнаёміла прысутных з доказамі, атрыманымі падчас расследаванняў крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**13 снежня. ЦБ.** Адбылася сустрэча бібліятэчных работнікаў з адвакатамі юрыдычнай кансультацыі Лунінецкага раёна Тамарай Аляксееўнай Грыцкевіч і Наталляй Іванаўнай Чухліб на тэму: “Наш выбор – наше будущее!” Падчас сустрэчы адвакаты падрабязна расказалі пра асноўныя этапы і парадак правядзення выбараў, а таксама пра рэалізацыю грамадзянамі свайго выбарчага права.

**20 снежня. ЦБ.** На базе Лунінецкай РЦБС прайшоў круглы стол для бібліятэчных работнікаў “Сучасная бібліятэка – сучаснаму карыстальніку: бібліятэкі Лунінецкай РЦБС ў Год якасці”. У ходзе мерапрыемства былі разгледжаны наступныя пытанні: “Укараненне інавацыйных форм работы з чытачом: з вопыту работы Мікашэвіцкай гарадской бібліятэкі”; “Абслугоўванне жыхароў маланаселеных і аддаленых вёсак: праца біблiёбуса”; “Сучасныя падыходы да арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання дзяцей і падлеткаў”; “Планаванне і справаздачнасць бібліятэк. Праблемы бібліятэчнай статыстыкі ў рамках гадавых планаў і справаздач”.
У завяршэнні мерапрыемства адбылося ўзнагароджанне пераможцаў раённага агляду-конкурсу на лепшую арганізацыю работы па грамадска-патрыятычнаму выхаванню “Отечество славлю, которое есть, но трижды - которое будет.